АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ
выдавецтва

Серыя «У дапамогу педагогу»
заснавана ў 1995 годзе па ініцыятыве У. П. Пархоменкі

Навукова-метадычны часопіс
Выдаецца з І квартала 1997 года
Рэгістрацыйны № 842
Выходзіць 6 разоў у год

# ГІСТОРЫЯ
## праблемы выкладання

У дапамогу педагогу
Серыя

**№ 6 (42) ' 2005**

**РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ**

**М. І. МІНЦКІ — галоўны рэдактар,** *кандыдат гістарычных навук*

**У. В. ТУГАЙ — першы намеснік галоўнага рэдактара,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**Н. М. ГАНУШЧАНКА — намеснік галоўнага рэдактара,** *кандыдат гістарычных навук*
**Л. В. САЛАМАХА — адказны сакратар**
**І. І. БАГДАНОВІЧ,** *кандыдат педагагічных навук*
**С. В. ПАНОЎ,** *кандыдат педагагічных навук*
**К. І. СЯКАЦКАЯ,** *метадыст АПА*
**С. М. ХОДЗІН,** *кандыдат гістарычных навук*
**В. М. ШУТАВА,** *кандыдат гістарычных навук*

**РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА**

**У. В. ТУГАЙ — старшыня**
**М. М. ЗАБАЎСКІ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**А. А. КАВАЛЕНЯ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**В. А. КАПРАНАВА,** *доктар педагагічных навук*
**Г. А. КОСМАЧ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**У. С. КОШАЛЕЎ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**М. С. СТАШКЕВІЧ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**В. М. ФАМІН,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**І. І. ЦЫРКУН,** *доктар педагагічных навук, прафесар*



**Заснавальнік і выдавец –**
**Установа «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"»**
220004, г. Мінск, вул. Караля, 16; тэл.: 200-02-28 (адк. сакратар),
200-10-73 (аддзел маркетынгу), факс: 200-54-10
e-mail: aiv@aiv.by, http:/www.aiv.by

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Да пытання аб развіцці гістарычнай адукацыі ў вышэйшай і сярэдняй школе БССР (60-я — пачатак 70-х гадоў)

*Павел Мацюш, аспірант кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ імя Максіма Танка*

9(47)
Б/Н4

Гістарычныя веды ў значнай ступені фарміруюць самасвядомасць асобы, дазваляюць у пэўнай ступені атаясамліваць чалавека з мінулым свайго народа, абуджаюць мысленне, ставячы складаныя і неадназначныя пытанні аб заканамернасці гістарычнага развіцця грамадства, мэтанакіраванасці гістарычнага працэсу, дапамагаюць адказаць на пытанні аб тым, хто з'яўляецца суб'ектам гісторыі, яе творцам. Крыніцай для перадачы такіх ведаў з'яўляецца сістэма гістарычнай адукацыі ў краіне.

Паспрабуем прааналізаваць стан гістарычнай адукацыі, вылучыць адмоўныя і станоўчыя моманты ў яе развіцці за гады трох пяцігодак будаўніцтва сацыялістычнага грамадства ў Беларусі. 8 красавіка 1959 г. Вярхоўным Саветам БССР быў прыняты Закон «Аб умацаванні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці сістэмы народнай асветы ў БССР» на аснове аднайменнага закона СССР ад 24 снежня 1958 г. Ён прывёў да канкрэтных змен у сярэдняй школе, у тым ліку і ў выкладанні гісторыі.

Замест усеагульнай сямігадовай уводзілася ўсеагульная васьмігадовая адукацыя. Побач з больш шырокім вывучэннем асноў навук у поўнай ступені ажыццяўлялася політэхнічная адукацыя і працоўнае навучанне. На працягу васьмі гадоў знаходжання ў школе вучням даваліся веды, у іх выпрацоўваліся навыкі не па адным, а па некалькіх відах працы, якія павінны былі мець грамадскае значэнне.

У 9–11 класах школьнікам давалі магчымасць пашырыць аб'ём і навуковы ўзровень ведаў, атрымаць адну з масавых прафесій на аснове спалучэння навучання з прадукцыйнай працай [1, с. 128–129].

Адначасова з такімі зменамі ў сістэме адукацыі 8 кастрычніка 1959 г. была прынята Пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб некаторых змяненнях у выкладанні гісторыі ў школах». У ёй быў вызначаны новы парадак размяшчэння гістарычных курсаў у сярэдняй школе. Так, з таго часу ў 4 класе вывучаліся эпізадычныя расказы па гісторыі СССР; у 5 — элементарны курс гісторыі старажытнага свету; у 6 — элементарны курс гісторыі сярэдніх вякоў; у 7–8 — элементарны курс гісторыі СССР з найважнейшымі звесткамі аб грамадскім і дзяржаўным уладкаванні Савецкай дзяржавы, а таксама звесткамі з новай і навейшай гісторыі замежных краін; у 9–11 класах уводзіўся сістэматычны курс новай і навейшай гісторыі замежных краін; Канстытуцыю СССР пачыналі вывучаць у 11 класе. Да таго ж была зноў зроблена спроба перабудаваць школьную гістарычную адукацыю на канцэнтрычнай аснове [2, с. 166].

Як вядома, сістэму школьнай гістарычнай адукацыі разам са зместам і асноўнымі прынцыпамі яе адбору вызначае структура, гэта значыць парадак, паслядоўнасць выкладання курсаў айчыннай і ўсеагульнай гісторыі ў навучальных установах. Існуюць два асноўныя варыянты арганізацыі гістарычнай адукацыі: *лінейны* і *канцэнтрычны*.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Лінейная структура школьнай гістарычнай адукацыі дапускае аднаразовае вывучэнне курсаў айчыннай і замежнай гісторыі. На працягу ўсіх гадоў навучання школьнікі ў храналагічнай паслядоўнасці знаёмяцца з найбольш яркімі і значнымі фактамі мінулага са старажытных часоў да сучаснасці.

Лінейны прынцып пабудовы гістарычнай адукацыі доўгі час быў традыцыйным для савецкай школы. У адпаведнасці з ім гісторыя выкладалася ў 1934–1959 гг. і ў 1965–1991 гг. Даўгалеццю лінейнай структуры ў школьнай гістарычнай адукацыі садзейнічалі яе бясспрэчная вартасць, пацверджаная практыкай. Яна дазваляе паслядоўна раскрыць асноўныя ступені (этапы) развіцця грамадства ад самых ранніх яго стадый да сучаснасці. Аднак аўтары школьных праграм і падручнікаў павінны былі спрашчаць змест гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў, абмяжоўвацца элементарным наборам сацыяльна-эканамічных і палітычных сюжэтаў, выкарыстоўваць адаптаваныя тэксты, пазбягаць складаных і супярэчлівых фактаў. Акрамя таго, магчымасці вярнуцца да ранейшых перыядаў паўторна, на больш высокім тэарэтычным узроўні, пры лінейнай структуры няма.

Галоўнай прычынай такога змянення ў выкладанні гісторыі стаў пераход да ўсеагульнай васьмігадовай адукацыі. Перад настаўнікам гісторыі была пастаўлена задача «вучыць школьнікаў самастойна набываць веды, самастойна думаць, разумець заканамернасці развіцця грамадства, нават пры васьмігадовай адукацыі». Для гэтага навучэнцы, якія заканчвалі васьмігадовую школу, павінны былі азнаёміцца з гісторыяй сваёй краіны і замежных краін з мінулага да сучаснасці [3, с. 29, 31].

З другога боку, калі савецкая школа вярнулася да дзесяцігадовага тэрміну навучання, ні аб якім асаблівым канцэнтры ў межах двух гадоў (9–10 класы) не магло быць і гаворкі. Пастановай партыі і ўрада «Аб змяненні парадку выкладання гісторыі ў школе» ад 14 мая 1965 г. прадугледжана «паслядоўнае, аднакратнае выкладанне гістарычнага працэсу». Аднак гэта не азначала поўнага вяртання да папярэдняй, лінейнай, структуры школьнага курса гісторыі, якая вызначала парадак вывучэння гістарычнага матэрыялу ў 1934–1958 гг.

Як ужо адзначалася, у 5 і 6 класах захоўваўся элементарны характар курсаў гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў, і таму аб'ём і змест падручнікаў гісторыі быў вызначаны з улікам узроставых магчымасцей навучэнцаў і ў асноўным не перагружаўся фактычным матэрыялам.

Важным дасягненнем у параўнанні са структурай 1934–1958 гг. з'яўляецца ўвядзенне ў 9–10 класах сістэматычнага курса найноўшай гісторыі ў аб'ёме 70 гадзін. Змест яго мае важнае ідэйна-выхаваўчае значэнне і падводзіць навучэнцаў да разумення асноўных праблем сучаснасці.

Завяршэннем і абагульненнем школьнага курса гісторыі з'яўляецца вывучэнне ў 10 класе курса грамадазнаўства (70 гадзін), заклікanaга, абапіраючыся на веды, атрыманыя пры вывучэнні гуманітарных, прыродазнаўчых і матэматычных дысцыплін, садзейнічаць фарміраванню ў навучэнцаў дыялектыка-матэрыялістычнага светапогляду.

Супастаўім колькасць гадзін на вывучэнне розных перыядаў гісторыі па праграме 1934–1940 гг. і па праграме 1966 г.:

| Назва дысцыпліны | Праграма 1934–1940 гг. | Праграма 1966 г. |
|---|---|---|
| Старажытная гісторыя | 120 | 70 |
| Сярэднявечча | 120 | 70 |
| Новая гісторыя да 1870 г. | 82 | 55 |
| Гісторыя СССР да 1861 г. | 122 | 96 |
| Разам на больш ранейшыя перыяды | 444 | 291 |
| Гісторыя СССР з 1861 г. да нашых дзён | 174 | 149 |
| Новая гісторыя (1870–1918) | 79 | 50 |
| Найноўшая гісторыя | — | 70 |
| Разам на перыяды, блізкія да сучаснасці | 253 | 269 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Калі праграма 1934–1940 гг. асноўную масу вучэбных гадзін (64 %) адводзіла на вывучэнне больш ранейшых перыядаў гісторыі, то праграма 1966 г. амаль што палову часу адводзіла на вывучэнне перыядаў, блізкіх да сучаснасці. Зменшана колькасць гадзін на вывучэнне гісторыі старажытнага свету, сярэднявечча (больш чым на 40 %) і новай гісторыі (больш чым на адну трэцюю частку). Тым не менш вырасла ўдзельная вага айчыннай гісторыі, вывучэнне якой пачынаецца ў 7 класе (са старажытных часоў да канца XVIII ст.). У 8 класе вывучаецца першы перыяд новай гісторыі (1640–1870) і гісторыя СССР у XIX ст.

Такім чынам, у межах абавязковай васьмігадовай школы навучэнцы атрымлівалі больш ці менш сістэматычныя веды па гісторыі СССР да 1895 г. і па гісторыі замежных краін да 1870 г. Важнейшыя падзеі першай трэці XX ст. не вывучаліся.

Сутнасным недахопам структуры школьнага курса гісторыі, што выкладаўся з 1966 г., было размеркаванне гістарычнага матэрыялу па гадах навучання без адпаведнасці з навуковай перыядызацыяй. Такое адвольнае рассячэнне матэрыялу мела месца ў вывучэнні гісторыі СССР у 7 класе, дзе курс быў даведзены да 1801 г., у выніку чаго вывучэнне працэсу разлажэння прыгоннага ладу і развіцця капіталістычных адносін у Расіі перапыняецца больш чым на паўгода, аднаўляючыся ў другім паўгоддзі ўжо ў 8 класе [4, с. 30–31].

Безумоўна, наваўвядзенні, што адбыліся ў сярэдняй школе, не маглі не закрануць і вышэйшую школу, у прыватнасці педагагічныя інстытуты, якія з'яўляліся асноўнай крыніцай папаўнення настаўніцкімі кадрамі.

На змест гістарычнай адукацыі ў вышэйшай школе адмоўна паўплывала практыка падрыхтоўкі студэнтаў педагагічных інстытутаў па здвоеных спецыяльнасцях. Так, яшчэ ў 1958 г. Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР зацвердзіла, згодна з Дзяржпланам СССР, новы пералік спецыяльнасцей для педагагічных інстытутаў. Спецыяльнасць «гісторыя» для пeдінстытутаў заставалася ў трох варыянтах: «руская мова і літаратура, гісторыя»; «родная мова і літаратура, гісторыя»; «гісторыя і геаграфія» (апошняя мелася толькі ў БССР) [5, с. 296–297]. Зразумела, што колькасць гадзін на вывучэнне гістарычных дысцыплін па здвоенай спецыяльнасці была меншай, чым у класічным варыянце спецыяльнасці «гісторыя». Так, напрыклад, па вучэбным плане 1962 г. спецыяльнасці «гісторыя і геаграфія» на геаграфічныя дысцыпліны адводзілася 1424 вучэбныя гадзіны, на гістарычныя — 1206, гэта значыць, на 214 гадзін, ці на 15,3 %, вучэбнага часу больш [6, с. 259]. Што датычыцца класічнай спецыяльнасці «гісторыя», то яна прысутнічала толькі ў якасці гуманітарнай спецыяльнасці для універсітэтаў.

У верасні 1960 г. у Гродзенскім пединстытуце быў спынены прыём на здвоеныя спецыяльнасці і адноўлены гістарычны факультэт (замест гісторыка-філалагічнага) з чатырохгадовым тэрмінам навучання [7, с. 67]. У Магілёўскім [8, с. 129] і Мінскім педагагічных інстытутах гісторыка-геаграфічны факультэт захоўваўся да 1963 і 1971 гг. адпаведна. З 1971 г. пачалася падрыхтоўка настаўнікаў гісторыі з дадатковай спецыяльнасцю «замежная мова» [9, с. 272].

Пачынаючы з 1970/71 навучальнага года, педагагічныя ВНУ краіны перайшлі па асноўных спецыяльнасцях на працу па новых вучэбных планах і праграмах. Вучэбны план спецыяльнасці № 2108 «гісторыя», зацверджаны Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР 27 лютага 1970 г., быў разлічаны на падрыхтоўку настаўніка гісторыі і грамадазнаўства сярэдняй школы за 4 гады. У параўнанні з вучэбным планам, які дзейнічаў раней, у гэтым плане на 6 тыдняў быў павялічаны час, які адводзіўся на тэарэтычнае навучанне, што дазваляла даць студэнтам больш глыбокую падрыхтоўку па спецыяльнасці і дысцыплінах псіхолага-педагагічнага цыкла.

У сувязі з увядзеннем новых дысцыплін, а таксама з мэтай паляпшэння праверкі ведаў студэнтаў і павышэння якасці падрыхтоўкі настаўніка, у новым вучэбным плане была павялічана колькасць экзаменаў і адпаведна на 7 тыдняў — агульная працягласць экзаменацыйных сесій. Улічваючы развіццё гістарычных і сумежных навук, увядзенне ў школах факультатыўных заняткаў, якія патрабавалі ад настаўніка больш глыбокіх ведаў па асобных праблемах гісторыі, у новым вучэбным плане павялічылася колькасць гадзін на курсы і семінары на выбар. Тэматыка гэтых курсаў, семінараў, факультатыўных дысцыплін была пашырана. Курс методыкі выкладання грамадазнаўства вылучаны ў самастойны.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У новым вучэбным плане таксама пашырыўся цыкл дысцыплін, якія знаёмілі студэнтаў з методыкай навукова-гістарычных даследаванняў. Акрамя курса «Археалогія» на працягу першага года навучання было прадугледжана вывучэнне дапаможных гістарычных дысцыплін і гістарычнага краязнаўства.

Педагагічнай практыцы ў ім адводзілася 17 тыдняў, у тым ліку: практыцы па выхаваўчай працы ў піянерскіх лагерах — 4, педагагічнай практыцы ў школе — 13 тыдняў, што было трохі менш, чым раней.

Гэты план прадугледжваў дзяржаўны экзамен «педагогіка з методыкай выкладання гісторыі і грамадазнаўства». Аб'яднанне ў апошнім педагогікі з методыкай выкладання гісторыі і грамадазнаўства дазволіла праверыць тэарэтычную падрыхтоўку выпускнікоў і ўменне выкарыстоўваць веды ў выкладанні канкрэтнай дысцыпліны.

Саветам інстытутаў (факультэтаў) у параўнанні з вучэбнымі планамі, якія дзейнічалі раней, асобным студэнтам, якія праявілі здольнасці ў навуковай працы, было дазволена здаваць адзін з дзяржаўных экзаменаў (акрамя гісторыі КПСС) выпускной работай з абаронай перад Дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіяй. Студэнтам, якія мелі выдатныя і добрыя адзнакі і прымалі актыўны ўдзел у працы навуковых гуртkoў, прадастаўлялася магчымасць удзельнічаць у конкурсах студэнцкіх навуковых работ, што, безумоўна, стымулявала іх пазнавальную дзейнасць [10, с. 8–9].

Агульнымі для ўсіх вучэбных планаў заставаліся прынцыпы партыйнасці, адзінства, навуковасці і сістэмнасці. *Прынцып партыйнасці* прадугледжваў арганізацыю вучэбна-выхаваўчага працэсу на аснове марксісцка-ленінскай тэорыі і камуністычнай ідэалогіі. *Прынцып адзінства* забяспечваў аднолькавасць вучэбных планаў для ўсіх універсітэтаў і педагагічных інстытутаў СССР. *Прынцып навуковасці* вызначаў тэарэтычную і практычную падрыхтоўку студэнтаў па шэрагу вучэбных прадметаў, колькасць гадзін на іх вывучэнне. *Прынцып сістэмнасці* забяспечваў адзінства і ўзаемасувязь прадметаў, што ўваходзілі ў вучэбны план, лагічнасць і паслядоўнасць у іх вывучэнні.

Такім чынам, змест гістарычнай адукацыі для сярэдняй і вышэйшай школы вызначаўся загадам з боку дзяржавы. Усе змены ў ім знаходзілі адлюстраванне ў вучэбных планах ВНУ па гістарычнай спецыяльнасці і праграмах сярэдніх школ па гісторыі.

У адпаведнасці з дырэктывамі XXIV з'езда КПСС па пяцігадовым плане развіцця народнай асветы на 1971–1975 гг., у краіне адбыўся пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі. За тры пяцігодкі былі ўведзены новыя вучэбныя праграмы, абнаўляліся вучэбныя планы і методыкі навучання гісторыі, выдаваліся новыя падручнікі па гісторыі (з 1960 па 1962 гг. упершыню для школ рэспублікі былі створаны падручнікі па гісторыі БССР Л. С. Абэцэдарскага, М. П. Бавы, Н. Г. Паўлавай), але сутнаснага змянення ў выкладанні гісторыі ў вышэйшай і сярэдняй школе не адбылося. Разам з тым яшчэ большая ўвага пачала надавацца фарміраванню ў вучняў і студэнтаў матэрыялістычнага разумення гістарычнага працэсу як адзінага навукова абгрунтаванага.


1. Об укреплении связи школы с жизнью. — М., 1961.
2. Документы и материалы по перестройке школы. — М., 1960.
3. Историческое образование в современной России : справочно-метод. пособие для учителей. — М., 2002.
4. *Вагин, А. А.* Методика преподавания истории в средней школе. — М., 1968.
5. *Моторова, Л. А.* Опыт профильной подготовки специалиста-историка в Беларуси в 50-е годы // Германский и славянский миры: взаимовлияние, конфликты, диалог культур (история, уроки, опыт, современность): материалы Междунар.-теорет. конф. 6–8 декабря. — Витебск, 2001.
6. *Матюш, П. А.* Опыт профильной подготовки историков в педагогических институтах Беларуси в 60-е — начале 70-х гг. XX в. // Айчынная і сусветная гісторыя: сучасныя погляды і метады даследавання : зб. навук. арт. — Мн., 2004.
7. *Габрусевіч, С. А., Крэнь, І. П.* Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы : гіст. нарыс. — Гродна, 2001.
8. Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А. А. Куляшова: мінулае і сучаснасць. — Магілёў, 2003.
9. Минский ордена Трудового Красного Знамени государственный педагогический университет имени А. М. Горького. — Мн., 1971.
10. Методическая подготовка студентов-историков в педагогическом вузе: материалы семинара преподавателей методики обучения истории и обществоведению пед. ин-тов РСФСР. 26–27 мая 1971 г. — М., 1972.